

# “Ад прадзедаў спакон вякоў
# Мне засталася спадчына...”

## Гісторыя неглюбскай тэкстыльнай традыцыі, элемента нематэрыяльнай культурнай спадчыны

"Каждая майстрыха па-свойму дзелае, штоб пахож быў. Хажу, упраўляюсь, а мечта ў мяне, як бы здзелаць, чі палучіцца. Як палюбіла, так зразу і здзелала"

кубак

нябесныя перавозы

"Ручнік к свету паднесці — ён сілу выдае"

неглюбскі строй

Неглюбка

панева







1917 | 1929 | 1940 | 1961 | 1970 | 1990 | 1998 | 1999 | 1999


Захавальнікі старадаўніх рамёстваў
свята ткацтва «Кросенцы»
гурток "Ніток"
ўзорныя калодкі
кросны
крывуля
гурток «Юныя ткачыхі»
хрэшчыкі
цэнтр ткацтва
неглюбскія ручнікі
2004
2004
2010
2010
2012
2013
2015
2020
2021

Пасля 1917 г. Неглюбка апынулася на тэрыторыі Гомельскай вобласці Беларусі, что часткова абумовіла новы штуршок у развіцці традыцыйнага касцюма, паліхромнага ткацтва і вышыўкі. Узнікненне ў канцы 1920-х гг. неглюбскіх пасёлкаў (Ляда, Канавалава, Свабода, Передавец, Рэпішча, Гібкі, Селішча, Перавессе, Сініцна) паскорыла гэтыя працэсы. Дух спаборніцтва, здаўна ўласцівы жыхарам Неглюбкі, патрабаваў удасканалення ў прыёмах ткацтва, вышыўкі, спалучэнні колераў. Развіваўся, удасканальваўся і пашыраўся арнаментальны фонд вышыўкі і ткацтва. Не меньш актыўна развіваліся тэкстыльныя традыцыі ў суседніх вёсках Браншчыны і новастворанаых пасёлках, блізкіх па сваёй мастацкай культуры. Культурныя ўзаемадзеянні, узаемныя ўплывы з XX ст. дазволілі сфарміраваць такую ўнікальнасць тэкстыльных прадметаў

Тэкстыльныя традыцыі в.Неглюбка – ўнікальная з’ява беларускай народнай творчасці: амаль поўстагоддзя знакамітыя неглюбскія ручнікі з’яўляюцца візітнай карткай Беларусі. Багацце і разнастайнасць тэхнік ткацтва і вышыўкі, складаная паліхромія, вялікі арнаментальны фонд з’яўляюцца асноўнымі прыкметамі элемента.
У ткацтве выкарыстоўваюцца бранае (аднаўточнае і двухуточнае), пераборнае (перабор “пад палатно”, двухбаковы і аднабаковы перабор), выбарнае, закладное, шматнітовая тэхніка. У вышыўцы шырока распаўсюджаныя набор, крыжык, лікавая і адвольная гладдзь, «строчка па выразах», тамбурны шоў, двухбаковы шоў-“роспіс”. Апроч таго, шырока выкарыстоўваюцца складаныя злучальныя швы (“неглюбская мярэжка”) і тэкстыльнае пляценне

Неглюбскі строй, адзін з найбольш архаічных і складаных строяў беларускага народнага адзення – старадаўні панёўны комплекс, у якім у высокай ступені гарманічна спалучаюцца белая арнаментаваная сарочка, дробнаклятчастая панёва-плахта, суконны фартух, нагрудны фартух ("запіна"), шырокі чырвоны пояс, узорная тканая хустка. Пры стварэнні прадметаў традыцыйнага касцюма сёння выкарыстоўваюцца практычна ўсе пералічаныя вышэй тэхнікі ткацтва і вышыўкі. Сучасныя майстры ажыццяўляюць перадачу характэрных для неглюбскай традыцыі тэхналогіі праз навучанне у гуртках, арганізаваных пры неглюбскім сельскім цэнтры ткацтва, у гуртку "Юныя ткачыхі" неглюбскай СШ, гуртку ткацтва Веткаўскага цэнтра творчасці дзяцей і моладзі

На сённяшні момант дзякуючы перадачы ўменняў у Неглюбскім сельскім цэнтры ткацтва, гуртку «Юныя ткачыхі», гуртку пры Веткаўскім раённым цэнтры творчасці дзяцей і моладзі, а таксама перадачы ведаў як самімі носьбітамі, так і навукоўцамі-этнографамі, працы Веткаўскага музея стараабрадніцтва і беларускіх традыцый імя Ф.Р.Шклярава, распаўсюджваюцца як веды аб самім элеменце, так і практычная магчымасці стварэння тканых прадметаў. Праводзяцца выставы, майстар-класы, ствараюцца наглядныя калекцыі арнаментальнага фонду для азнаямлення.
Уменні перадаюцца ад носьбітаў культуры на базе гурткоў у горадзе Ветка і ў самой Неглюбцы, шляхам паступальнага навучання на традыцыйных ткацкіх станках з выкарыстаннем сучасных нітак па цалкам аўтэнтычных тэхніках. Навучанне адбываецца як па стварэнні рушнікоў і палотнаў у традыцыйным стылі, так і з выкарыстаннем новых узораў і спалучэння арнаментаў у тэхнікі арнаментыкі, але на базе традыцыйнай тэхналогіі. Асаблівую адказнасць за практыку і перадачу элемента нясе Неглюбскі сельскі цэнтр ткацтва шляхам перадачы традыцыі ў тым ліку і ў камерцыйных мэтах, аднак жаночая мясцовая супольнасць носьбітаў (многія з якіх працуюць ў Цэнтры ткацтва) сочыць за захаваннем асаблівасцей традыцыі. Веды акумуліруюцца і перадаюцца ў навуковых колах шляхам выдання манаграфій, экспедыцыйных сшыткаў з апытаннямі носьбітаў традыцыі і напісання навуковых артыкулаў

Ткацтва – неад’емная частка беларускай культуры і мастацтва. У ім адлюстраваны ўсе перыпетыі сацыяльнай гісторыі народа, яго характар, ментальныя і духоўныя перавагі. У сапраўдны момант неглюбская тэкстыльная традыцыя з’яўляецца маркерам прыналежнасці і высокай павагі да мясцовай традыцыі сярод мясцовых жыхарак. Дзякуючы наяўнасці і захаванню традыцыі Неглюбка – вядомы ў шырокіх колах цэнтр ткацтва, які прываблівае аматараў з усёй краіны. Функцыю сацыялізацыі ў супольнасці нельга недаацаніць, дзякуючы заняткам па ткацтве і перадачы ведаў ад старэйшага пакалення да маладога, забяспечваюцца зносіны паміж пакаленнямі і пераемнасць традыцыі арганічнымі метадамі. Мясцовая супольнасць майстрых і гурток па ткацтве ўдзельнічаюць ў арганізацыі і правядзенні культурных мерапрыемстваў у вобласці і раёне, атрымліваючы мноства станоўчых водгукаў і натхняючыся на далейшую працу. Праз наяўнасць вядомай тэкстыльнай традыцыі развіваецца і турыстычна-рэкрэацыйны патэнцыял рэгіёну, павялічваючы дабрабыт мясцовай супольнасці. Існаванне традыцыі напаўняе культуру Днепра-Сожскага рэгіёну і рэспублікі ў цэлым, выклікае цікавасць сярод навуковых і музейных устаноў. На думку экспертаў, занятак ткацтвам у рамках хобі сучасных гарадскіх жыхароў выконвае спецыфічную кампенсаторную функцыю, забяспечвае задавальненне творчых патрэб, імкненне да самарэалізацыі, а жаданне ўзаемадзейнічаць з прыродным матэрыялам выключна актуалізуецца ў гарадскім асяроддзі

Сёння веды і навыкі, перадаюцца ад пакалення да пакалення (майстры розных пакаленняў), праз навучанне ў гуртках пры Неглюбскім сельскім цэнтра ткацтва і школе. Праводзяцца выставы, майстар-класы, ствараецца наглядная калекцыя арнаментальнага фонду ў цэнтры ткацтва. Цэнтрам падтрымкі і ўзнаўлення тэкстыльных традыцый в. Неглюбка з'яўляецца Неглюбскі сельскі цэнтр ткацтва (Рашэнне Веткаўскага райвыканкама № 1020 ад 7 кастрычніка 2010 г. "Аб рэарганізацыі Неглюбскага сельскага дома культуры ў Неглюбскі сельскі цэнтр ткацтва"). У цэнтры працуе тры майстра: Л.В. Кавалёва, Т.П. Суглоб, Е.М. Дзямчыхіна. У гуртку "Ніток" пры цэнтры сёння займаюцца 10 дзяцей і дарослых. Кіраўнікі гурткоў разам з дзецьмі, засвоіўшы асноўныя прыёмы ткацтва і вышыўкі, вырабляюць традыцыйныя для Неглюбкі ручнікі, элементы касцюма (рубахі, наміткі, хусткі, галаўны ўбор дзяўчыны, традыцыйныя ўпрыгожванні), сувенірныя вырабы. Майстрам Л.В. Кавалёвай адноўлена страчаная тэхніка ткацтва панёў. Майстры і навучэнцы выкарыстоўваюць адноўленыя касцюмы ў практычнай дзейнасці

Цэнтр ткацтва актыўна ўдзельнічае ў выстаўках дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва раёна, вобласці і рэспублікі. У Цэнтры ткацтва ў 2011 г. было створана аматарскае аб’яднанне ткачых “Кацелачкі”, якое наведваюць неглюбскія майстрыхі старэйшага пакалення, перадаюць навыкі і веды мастрам і навучэнцам. Пры Цэнтры дзейнічае пакой беларускага народнага побыту і гісторыі ткацтва «Аповесці жыцця». Майстрамі Цэнтра ткацтва распрацаваны і выраблююцца разнастайная сувенірная прадукцыя на аснове мясцовых тэхналогій і арнаментаў (ручнікі, сурвэткі, сумачкі, траўніцы і г.д.).

У 2013 г. майстрамі цэнтра ткацтва былі вытканы рушнікі, якія перададзены ў Пасольства Рэспублікі Беларусь у Кітаі.

Дзякуючы падтрымцы ўпраўлення культуры Гомельскага аблвыканкама пры Цэнтры з’явіліся крама па рэалізацыі сувенірнай прадукцыі і невялікі музейны пакой гісторыі мясцовага рамесніцтва.

У студзені 2015 г. калектыву Неглюбскага сельскага цэнтра ткацтва была ўручана спецыяльная прэмія Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь за значныя дасягненні ў справе адраджэння і развіцця народных рамёстваў, захаванне і папулярызацыю традыцыйных тэхналогій вытворчасці неглюбскіх ручнікоў (Указ № 650 ад 30 снежня 2014 г. Аб прысуджэнні спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва 2014 года.)

Унікальнасць неглюбскай мастацкай традыцыі стала шырока вядомай у 1970-я гады дзякуючы шэрагу буйных выстаў і культурных акцый. Выдатныя прыклады ўмельства неглюбскіх майстрых дэманстраваліся не толькі на выставах дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ў СССР, але ў Італіі, Германіі, Вялікабрытаніі, Японіі, Бельгіі, Францыі, Канадзе, ЗША. Неглюбскія рушнікі ўпрыгожваюць адну з залаў ААН.

Неглюбскія рушнікі — гісторыка-культурная каштоўнасць Рэспублікі Беларусь (gp.by)

Для вырабу тканых прадметаў выкарыстоўваюць ткацкія станкі ("кросны"), ніткі (льняныя, баваўняныя, змешаныя, сінтэтычныя), для вышыўкі прадметаў інтэр'ера і адзення карыстаюцца сучаснай льняной і баваўнянай тканінай

Катастрафічнае затуханне традыцый ткацтва і вышыўкі у 1990-я гды звязана з адсяленнем карэнных жыхароў Неглюбкі, закрыццём ткацкай майстэрні Гомельскай фабрыкі мастацкіх вырабаў, скарачэннем выставачнай дзейнасці ў раёне і вобласці. Аднак, у апошняе дзесяцігодде адбываецца
актывізацыя дзейнасці ўстаноў культуры і адукацыі па падтрымцы мясцовага мастацтва

Умовы аднаўлення элемента сёння ўнікальныя – традыцыя захоўваецца жыхарамі старэйшага пакалення жанчын-майстрых, аднаўленнем элемента займаюцца жанчыны сярэдняга ўзросту, якія пераняли майстэрства ад носьбітаў традыцыі і перадаюць дзецям і падлеткам. Зараз у Неглюбцы актыўна працуе 5 майстроў, якія займаюцца, у асноўным, ткацтвам, але паступова засвойваюць прыемы мясцовай вышыўкі. Такія майстры, як Л.В. Кавалёва, 1961 г. н. і Т.Суглоб, 1970 г. н., маюць уласныя мастацкія стылі, што і раней было характэрным для вядомых неглюбскіх майстрых.

[В поисках жемчужин белорусского Полесья: Неглюбка | Новости Гомеля (newsgomel.by)]

Веды і навыкі, звязаныя з вырабам традыцыйнага тэкстылю і адзення, выконваюць некалькі важных сацыяльных функцый.
У першую чаргу яны з’яўляюцца сродкам культурнай і нацыянальнай самаідэнтэфкацыі для жыхароў азначанай тэрыторыі і шматлікіх постчарнобыльскіх перасяленцаў, якія жывуць у Беларусі і за яе межамі.
Жанчыны старэйшага пакалення, якія перасяліліся ў іншыя раёны рэспублікі, перанеслі мясцовыя ўменні і навыкі па вырабу прадметаў інтэр’ера і нават распаўсюдзілі іх у месцах новага пражывання, як напрыклад, Алена Іванаўна Баннік, 1929 г.н. (в. Шчадрын Жлобінскага раёна Гомельскай вобласці)
.

Носьбіты, выканаўцы, удзельнікі, актыўна далучаныя да выканання (узнаўлення) элемента, уключаючы прозвішча, імя, імя па бацьку, узрост, пол, прафесію На дату 15 2 2016 г.

Майстры старэйшага пакалення, захавальнікі традыцый:

Астапенка Софья Міхайлаўна, 1940 г. н., нарадзілася ў в. Неглюбка, пенсіянерка, праваслаўнага веравызнання, майстэрству ткацтва і вышыўкі навучалася ад маці і бабулі, патомная майстрыха. Распрацавала і выткала ў мясцовай традыцыі харугвы для Неглюбскай Свята-Мікалаеўскай царквы.

Дзямчыхіна Еўфрасіння Іванаўна, 1940 г. н., нарадзілася ў в. Неглюбка, пенсіянерка, праваслаўнага веравызнання, майстэрства ткацтва і вышыўкі пераняла ад маці і бабулі, патомная майстрыха.

Кавалёва Вера Фёдараўна, 1940 г. р., нарадзілася ў в. Неглюбка, пенсіянерка, праваслаўнагаверавызнання, майстэрству ткацтва і вышыўкі навучалася ад маці і бабулі, патомная майстрыха

У ручніку два віды стыхійных сімвалаў (вады-змяі-плыні). Крайняя "крывуля" — зігзаг, быццам ручаіна за вёскай, край і мяжа. Тысячагоддзямі вызначаліся верхнія і ніжнія воды (усё залежыць ад таго, ляжыць ці вісіць ручнік). "Крывуля" заўсёды — падзел стыхійнай, непазнанай і культурнай, забудаванай прасторы. Яшчэ раз стыхійны сімвал бесперапыннасці ўзнікае перад самым цэнтрам ці, дакладней, ахоплівае яго. Гэта таксама "крывуля", але ў Неглюбцы (Веткаўскі раён) і наваколлі яна завецца "вялікая крывуля". Яна мае выгляд пульсуючай плыні, мы бачым маленькія знакі агню каля яе і нават усярэдзіне. Гэта "крывуля", якая вырасла і насыцілася жыватворнаю сілай (вада + агонь). Параўнайце ўяўленне пра "бялесага змея", які шкодзіць чалавеку, і пра "жарага змея", які дапамагае (запіс Г.Лапціна, в. Барталамееўка Веткаўскага раёна).

Галіна Рыгораўна Нячаева,
дырэктар Веткаўскага музея
стараабраднiцтва і беларускіх традыцый ім. Ф.Р. Шклярава.
Апублікавана: Мастацтва, 2’1999.

в Неглюбке, как и в начале 1990-х, продолжал действовать филиал Гомельской фабрики художественных изделий. На его базе тогда был открыт и школьный учебно-производственный комплекс. Многие выпускницы оставались здесь работать. Но ткацкая артель закрылась из-за нерентабельности.

В белорусской деревне Неглюбка начали возрождать народные промыслы - Российская газета (rg.ru)